# МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ Ў ПРАСТОРЫ БІБЛІЯТЭКІ

***Ястраб Фёдар Адамавіч**, загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці НББ*

*Освещена практика осуществления художественных проектов в галерейно-выставочном комплексе Национальной библиотеки Беларуси. Раскрываются новые возможности в создании культурного пространства библиотеки, используя галерейные технологии.*

Так сталася, што Мінск – амаль двухмільённы горад, насычаны сучаснай інфраструктурай, тысячамі розных установ, прадпрыемстваў, гандлёвых цэнтраў, на правах сталіцы акумулюючы найбольш значныя творчыя сілы краіны, мастацкіх выставачных пляцовак мае ў дзесяткі разоў менш, чым іншыя, зусім невялікія па нашых мерках заходнія гарады. Да прыкладу ўзгадаем амерыканскі гарадок Санта-фэ, у якім размяшчаецца каля пяцісот мастацкіх галерэй, ці бельгійскі Кнокке, галерэі якога ведаюць не толькі ў Еўропе.

Пра ўзровень патэнцыяльных магчымасцей, статус, аб'ём зваротных сродкаў у параўнанні з беларускімі галерэямі ўвогуле цяжка гаварыць, бо параўноўваць пакуль няма з чым – нашы галерэі не ўключаны ў інфраструктуру сусветнага арт-рынку. Такая ізаляванасць беларускіх галерэй ад знешніх рынкаў дазваляе гаварыць аб іх як выключна рэгіянальным, мясцовым феномене. Цэны на творы мастацтва, прадстаўленыя такімі галерэямі, зразумела, не могуць фарміравацца па законах міжнароднага арт-рынку, а вызначаюцца ў многім не заўсёды высокім мастацкім густам мясцовых эліт, якія пачынаюць набываць вагу як патэнцыяльныя пакупнікі, а таксама нешматлікім попытам досыць кемлівых "варагаў"-іншамоўцаў, якім можа ўсміхнуцца ўдача дастаткова якасны мастацкі твор набыць па нізкай (па заходніх мерках) цане. Па сутнасці, галерэя, якая з'яўляецца суб'ектам дастаткова складанай сістэмы сацыяльнага існавання мастацтва, не можа паўнавартасна выконваць адну з важнейшых сваіх функцый – цэнавую (фінансавую) экспертызу. Спецыфіка дзейнасці нашых галерэй пры такіх умовах у тым, што яны, на самой справе, у асноўным працуюць на выкананне тых задач, якія вызначаюць дзейнасць так званых альтэрнатыўных выставачных прастораў на Захадзе.

Адна з такіх задач – стварэнне паблісіці мастаку. Мастак – асоба публічная. Яго самога і яго мастацтва павінны ведаць. Пакуль творы мастака ў майстэрні, дыялога з гледачом – а менавіта гэтага імкнецца дасягнуць сапраўдны мастак – не атрымаецца. Твор мастацтва пачынае "гаварыць" толькі ў кантэксце музейнай прасторы ці выстаўкі. Кантэкстам можа быць персанальная выстаўка мастака, дзе можна назіраць яго творчую эвалюцыю, а можа быць і групавая выстаўка, дзе творы розных мастакоў могуць дапаўняць і падтрымліваць адзін аднаго, праўда, у тым выпадку, калі экспазіцыя зроблена ўдала.

Праходзячы па залах галерэй, мы прымаем непасрэдны ўдзел у тым дыялогу, які вядуць паміж сабой мастакі, дапаўняючы яго сваімі эмоцыямі, культурнымі звычкамі, інтэлектам і багатымі асацыяцыямі. Важнасць такога дыялогу гледача з мастаком бясспрэчная. Сучаснае мастацтва – гэта не маналог мастака-алімпійца. Дыялог з’яўляецца яго асновай, сутнасцю, філасофіяй існавання і нязменным рухавіком. Адна з важнейшых умоў ажыццяўлення дыялогу – наяўнасць выставачнай прасторы, таго “рысталішча”, дзе сустракаюцца дух і талент мастака з культурнай традыцыяй гледача. Чым больш такіх “рысталішч” у горадзе, чым больш публікі ўцягнута ў ціхую размову інтэлекту і пачуццяў, тым лепш. Лепш, безумоўна, для творцы і лепш для культурнага асяродка ўвогуле. Таму з’яўленне новай, да таго ж не звычайнай галерэі – з’ява ў многім вызначальная і адметная. Адкрыццё ў ліпені гэтага года галерэйна-выставачнага комплексу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі дае магчымасць ажыццяўлення разнастайных маштабных праектаў. Гэта падцвярджае з самых першых дзён практыка яго існавання: былі ажыццёўлены такія буйныя праекты, як рэспубліканскія выстаўкі “Прысвячэнне Беларусі”, “Арт-крок”. Зараз у сценах комплексу праходзіць першы Міжнародны фестываль пейзажа, прысвечаны народнаму мастаку Беларусі Віталю Цвірку, у якім прымаюць удзел мастакі з 12 краін – ЗША, Кубы, Турцыі, Сербіі, Арменіі, Малдовы, Украіны, Расіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Беларусі. Ажыццяўленне такіх праектаў стала магчымым дзякуючы вялікаму экспазіцыйнаму патэнцыялу галерэйна-выставачнага комплексу – гэта чатыры галерэі на 2, 3 і 22 паверхах будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі агульнай плошчай каля 2000 м$^2$.

Сама па сабе ідэя размясціць пад адной страхой бібліятэку і галерэю не з’ўляецца новай. Ва ўсім свеце гэта даўно стала звычайнай практыкай. Таму прыкладаў такога арганічнага суіснавання вельмі шмат – бібліятэка Кангрэса ЗША, Нацыянальныя бібліятэкі Францыі, Англіі, Германіі, Славакіі... Будынак Нацыянальнай бібліятэкі Эстоніі, дарэчы, мае шэсць выставачных залаў.

Сучасныя бібліятэкі паступова адыходзяць ад стэрэатыпаў класічнай бібліятэкі. Гэта ўжо не толькі месца, дзе можна папрацаваць з кнігай. Бібліятэкі паступова ператвараюцца ў буйныя інфармацыйныя і сацыякультурныя цэнтры, дзе можна атрымаць цэлы спектр розных паслуг. Сёння чытач, наведаўшы бібліятэку, можа прагледзець відэафільм, папрацаваць у інтэрнэт-сетцы, праслухаць музычны твор, пазнаёміцца з новымі мастацкімі творамі ў галерэйнай экспазіцыі. Галерэя стала арганічнай часткай прасторы бібліятэкі. Прычын таму многа – гэта і вялікая патрэба ў эстэтызацыі бібліятэчных інтэр’ераў, гэта і рашэнне культурна-асветніцкіх задач, выхаванне высокага мастацкага густу і эстэтычнай культуры, урэшце, гэта адзін са спосабаў прыцягнення патэнцыяльных чытачоў, наведвальнікаў, далучэння да духоўных крыніц свайго народа, яго традыцый.

Перманентныя мастацкія выстаўкі, як эфектыўны сродак PR, пры ўмелым рэкламна-інфармацыйным асвятленні у СМІ могуць і павінны стаць моцнай і эфектыўнай асновай для стварэння станоўчага іміджа бібліятэкі.